УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны
лінгвістычны ўніверсітэт»
_______________ А.П.Бятэня

«_3_» _декабря_ 20_21_ г.

Рэгістрацыйны № УД-_9102/08-П_/вуч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасцей:

1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па накірунках)»
1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па накірунках)»
1-02 03 08 «Замежная мова (з указаннем мовы)»

2021 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы па абавязковым модулі «Гісторыя» (Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі) для ўстаноў вышэйшай адукацыі (зацверджана намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь 30.06.2014 г. Рэгістрацыйны нумар № ТД-СГ.023/тып.) і вучэбных планаў установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» па спецыяльнасцях 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па накірунках)», 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па накірунках)», 1-02 03 08 «Замежная мова (з указаннем мовы)».

**УКЛАДАЛЬНІКІ:**

С. Я. Новікаў, загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

А. Г. Цымбал, дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»,
(пратакол № 1 ад 31 жніўня 2021 года);

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»,
(пратакол № 2 ад 03.12.2021 года)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі» з'яўляецца састаўной часткай сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў універсітэта.

Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне і развіццё сацыяльна-асабовых кампетэнцый, прафесійных ведаў і практычных навыкаў, неабходных і дастатковых для вырашэння і выканання грамадскіх, сацыяльна-прафесійных і асабовых задач і функцый.

Засваенне матэрыялу вучэбнай дысцыпліны дазволіць у значнай ступені паглыбіць гістарычныя кампетэнцыі будучых выкладчыкаў замежных моў, перакладчыкаў, лінгвістаў, спецыялістаў па міжкультурных камунікацыях, лепш асэнсаваць неабходнасць выпрацоўкі аб'ектыўнага навуковага погляду на гісторыю беларускага народа, які сфарміраваўся ў працэсе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў. Авалоданне гістарычным катэгарыяльным апаратам не толькі забяспечвае падрыхтоўку спецыяліста-прафесіянала, але і фарміруе асобасныя якасці грамадзяніна і патрыёта ў працэсе вывучэння лінгвістычных дысцыплін.

Асноўнымі задачамі вывучэння вучэбнай дысцыпліны з'яўляюцца:

- фарміраванне ў студэнтаў ведаў, уменняў і навыкаў па аналізу заканамернасцяў і асаблівасцяў дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага, духоўнага развіцця беларускага народа, якія ўвасоблены ў калектыўнай гістарычнай памяці і служаць асновай для нацыянальнай самасвядомасці пры ўспрыманні гісторыі як пэўнай сістэмы каштоўнасцяў, якія ўзніклі ў працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа і эвалюцыі яго дзяржаўнасці;
- засваенне студэнтамі сістэмы духоўных, культурных, матэрыяльных каштоўнасцяў беларускага народа, і развіццё на гэтай аснове здольнасці да самарэалізацыі ва ўмовах сучаснай сацыякультурнай сітуацыі з асэнсаваннем сваёй ідэнтычнасці і перспектыў будучага развіцця;
- гатоўнасць выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у аб'ёме сваіх кампетэнцый, сфарміраваных у выніку ўсвядомленага засваення і выкарыстання вучэбнай гістарычнай інфармацыі, садзейнічаць далейшаму развіццю сваёй краіны.

У сістэме сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбнымі планамі спецыяльнасцей 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)», 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па напрамках)», 1-02 0308 «Замежная мова (з указаннем мовы)» вучэбная дысцыпліна «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі» з'яўляецца дысцыплінай дзяржаўнага кампаненту.

У агульнай сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў змест вучэбнай дысцыпліны ўзаемазвязаны з наступнымі вучэбнымі дысцыплінамі: «Паліталогія», «Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці», «Культуралогія».

Веданне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі» з'яўляецца базай для вывучэння наступных вучэбных дысцыплін: «Ідэалогія беларускай дзяржаўнасці».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі) студэнты павінны *ведаць*:

- асноўныя тэорыі грамадскага развіцця, асаблівасці фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый;
- галоўныя этапы складвання беларускага этнасу ў асобныя гістарычныя перыяды;
- гістарычныя мадэлі мадэрнізацыі грамадства і дзяржавы, савецкі варыянт мадэрнізацыі і цывілізацыйнага развіцця беларускага грамадства;
- важнейшыя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа;
- гістарычныя этапы развіцця дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, станаўлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;
- месца і ролю беларускіх земляў у геапалітычных працэсах ў асобныя гістарычныя перыяды, уклад беларускага народа ў перамогу над германскім фашызмам, значэнне і месца суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце;

*умець:*

- выкарыстоўваць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі для характарыстыкі асаблівасцяў гістарычнага развіцця беларускага народа;
- характарызаваць умовы і вынікі складвання беларускага этнасу ў асобныя гістарычныя перыяды;
- ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі функцыянавання савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР, вызначаць сутнасныя характарыстыкі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця;
- тлумачыць уплыў асобных культурна-цывілізацыйных фактараў на развіццё Беларусі і ацэньваць асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі; выкарыстоўваць культурна-гістарычную спадчыну Беларусі ў сваёй прафесійнай дзейнасці і памнажаць яе;
- аналізаваць працэс складвання беларускай дзяржаўнасці, афармлення і замацоўвання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;
- характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель у асобныя гістарычныя перыяды, ацэньваць значэнне Перамогі савецкага народу ў Вялікай Айчыннай вайне, аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветнай глабалізацыі;

*валодаць:*

- гістарычным паняційным апаратам і асноўнымі датамі з гісторыі Беларусі;
- інтэгратыўнымі ведамі па этнічнай гісторыі, гісторыі беларускага народа і беларускай нацыі ў кантэксце эвалюцыі еўрапейскай цывілізацыі;
- практычнымі падыходамі да самаарганізацыі адукацыйнага працэсу;
- новымі тэхналогіямі набыцця, выкарыстанні і абнаўлення гістарычных ведаў;
- сістэмай матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцяў, створаных у працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа, для самарэалізацыі ва ўмовах сучаснага сацыякультурнага развіцця;
- уменнямі аналізу заканамернасцяў і асаблівасцяў дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнана, канфесійнага, духоўнага развіцця беларускага народа з улікам цывілізацыйных характарыстык і выхавання на гэтай аснове пачуцця адказнасці да будучы лёс краіны;

У адпаведнасці з тыпавой праграмай засваенне вучэбнай дысцыпліны накіравана на забеспячэнне фарміравання і развіцця наступных кампетэнцый:

акадэмічных:

*АК-1.* Валодаць і ўжываць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

*АК-2.* Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

*АК-3.* Валодаць даследчымі навыкамі.

*АК-4.* Валодаць уменнямі працаваць самастойна.

*АК-5.* Валодаць здольнасцямі інтэграваць новыя ідэі (крэатыўнасць).

*АК-6.* Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

*АК-7.* Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

сацыяльна-асобасных:

*САК-1.* Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

*САК-2.* Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

*САК-3.* Валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый.

*САК-4.* Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне).

*САК-5.* Умець працаваць у камандзе.

*САК-7.* Валодаць здольнасцямі арыентавацца ў сістэме агульначалавечых каштоўнасцей і улічваць асаблівасць каштоўнасна-сэнсавых арыентацый розных сацыяльных, нацыянальных, рэлігійных і прафесійных супольнасцяў і груп у дакладным соцыўме.

прафесійных:

У арганізацыйна-кіруемай дзейнасці:

*ПК-5.* Аналізаваць і ацэньваць сабраныя даныя.

У вытворча-практычнай дзейнасці:

*ПК-22.* Развіваць пазнавальныя патрэбы, матывы і інтарэс студэнтаў, фарміраваць у іх крытычнае мысленне ў працэсе вывучэння гісторыі беларускага народа.

У вучэбна-метадычнай дзейнасці:

*ПК-38.* Ажыццяўляць адбор і сістэматызацыю гістарычных фактаў для вучэбных заняткаў з улікам патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да валодання імі, і ступені падрыхтаванасці студэнтаў

У выхаваўчай дзейнасці:

*ПК-47.* Фарміраваць агульную культуры студэнтаў на аснове патрыятычных перакананняў, духоўных і маральных каштоўнасцяў, выхоўваць сацыяльную талерантнасць, інтарэс і павагу да прадстаўнікоў іншых цывілізацый.

У навукова-даследчай дзейнасці:

*ПК-54.* Карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай;

*ПК-55.* Ажыццяўляць адбор матэрыялу для правядзення даследаванняў;

*ПК-57.* Рыхтаваць навуковыя рэфераты (эсэ), тэзісы выступленняў і дакладаў.

У інавацыйнай і інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці:

*ПК-59.* Ажыццяўляць пошук, сістэматызацыю і аналіз інфармацыі па інавацыйных тэхналогіях у вобласці гісторыі.

*ПК-60.* Фарміраваць банк даных інавацыйных тэхналогій па розных аспектах выкладчыцкай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і выхаваўчай дзейнасці дзеля далейшага развіцця краіны.

Змест вучэбнай дысцыпліны, формы кантролю і тэхналогіі навучання накіраваны не толькі на набыццё студэнтамі тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў, неабходных для засваення спецыяльнасці, але і на развіццё каштоўна-асобаснага, духоўнага патэнцыялу навучэнцаў, фарміраванне ў іх грамаўска-патрыятычных якасцей, гатоўнасці да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі спецыяльнасцей 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)», 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па напрамках)» агульная колькасць гадзін, адведзеных на праходжанне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі», складае 72 акадэмічных гадзіны, з якіх 34 аўдыторных гадзіны (18 лекцыйных гадзін і 16 гадзін семінарскіх заняткаў); для спецыяльнасці 1-02 03 08 «Замежная мова (з указаннем мовы)» агульная колькасць гадзін складае 72 акадэмічных гадзіны, з іх – 8 лекцыйных аўдыторных гадзін. Самастойная работа студэнтаў плануецца ў аб'ёме 38 акадэмічных гадзін. Па вучэбнай дысцыпліне прадугледжана напісанне выніковага эсэ.

Вучэбнай дысцыпліна вывучаецца на працягу аднаго семестра (у I і II семестрах) на 1 курсе навучання студэнтаў.

Формай бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне з'яўляецца дыферэнцаваны залік. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 2 заліковыя адзінкі.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – *вочная (дзённая) па спецыяльнасцях* 1-21 06 01 «Сучасныя замежныя мовы (па напрамках)», 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па напрамках)», *завочная па спецыяльнасці* 1-02 03 08 «Замежная мова (з указаннем мовы)».